Граблеўская С.А., студ. гр. 205 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Міцкевіч А.Г.,
ст. выкладчык

# РЭСТАЎРАЦЫЯ БАНДАРНЫХ ВЫРАБАЎ

Бондарства – гэта прамысловая сялянская галіна, якая з'явілася яшчэ ў старажытнасці. З развіццём гаспадаркі і гандлю з'явілася неабходнасць захоўваць вялікую колькасць розных прадуктаў і перавозіць іх на вялікую адлегласць у больш трывалых ёмкасцях. Кераміка, канешне, падабалася людям, але было цяжка зляпіць вялізны чан, ды і пры перавозцы дрэва больш трывалае.

Як кустарны промысел гэтая галіна вытворчасці была вельмі развіта. Бандарныя вырабы – гэта бочкі, кадушкі, вёдры, ушаты, чаны і мн. інш.— самыя неабходныя прадметы хатняга побыту, асабліва у сельскай мясцовасці.

Галоўнае патрабаванне да драўніны, з якой вырабляюць бочкі – каб яна не прапускала налітай у бочку вадкасці, не змяняла паху і колеру.

Дрэва для бандарных дошчак павінна быць не гнілое, не слізкае. Акрамя таго яно павінна быць адпаведна высушаным. Калі дрэва недастаткова высушана, то потым выраб пачне губляць сваю трываласць, усыхацца і каробіцца.

Гэты не вялікі уступ дазваляе зразумець, што бочка як надзвычай карысны, так і дастаткова складаны выраб. Гэта адно з незвычайных і цікавых дасягненняў нашых продкаў.

Зараз ужо бандарныя вырабы не вякарыстоўваюцца так шырока, як раней. Цяпер людзі больш карыстаюцца сучаснымі матэрыяламі, такімі як розныя пластыкі і сплавы. Але мы не павінны забываць пра гісторыю і тэхналогію стварэння клепачнага драўлянага посуду (малых і вялікіх формаў), якая дайшла да нас.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Драўніна як арганічны матэрыял падвержана старэнню і працэсам разбурэння, з якіх асноўнымі з'яўляюцца біялагічныя фактары. Таму практычна ва ўсіх выпадках рэстаўратар мае справу з часткова разбуранай драўнінай, таксама з матэрыялам са зменнай структурай, у большай ці меншай ступені заражанымі грыбамі і дрэваразбураючымі насякомымі. З цягам часу змяняецца і хімічны склад драўніны, а з-за парушэння структуры моцна змяняецца водапаглынанне.

Працэссы, звязаныя з рэстаўрацыяй бандарных аб'ектаў, маюць некалькі накірункаў:

• Ачыстка паверхні

• У выпадку мокрай драўніны – абязвожванне ці змяншэнне ўтрымання вады

• Антысептыраванне (абеззаражванне)

• Умацоўваючая прапітка аслабленых участкаў

• Ахоўная і дэкаратыўная апрацоўка паверхні

Вялікую цікавасць для ўмацавання часткова разбуранай драўніны ўяўляюць сучасныя сінтэтычныя рэстаўрацыйныя палімеры. Для кансервацыі драўніны выкарыстоўваюцца поліметыл- і полібутылметакрылаты, валіфлекс – сапалімер вініхларыда з вінібутылавым эфірам, акрылавыя смолы і сапалімеры акрылатаў.

Галоўная адметнасць у рэстаўрацыі бандарных вырабаў – неабходнасць засваення традыцыйных тэхналогій промыслу. Без гэтага рэстаўратар не зможа правільна падабраць рассыпаныя клепкі. Шмат у якіх прадметаў некаторых клепак альбо дна можа не хапаць – патрэбна ўмець іх вырабіць. Ведьмі часта зламаныя альбо страчаныя драўляныя абручы – патрэбна як умець вырабіць, так і правільна надзець.

У наш час існуе шмат матэрыялаў якія дапамогуць захаваць унікальныя музейныя прадметы, але задача кожнага рэстаўратара і ўсіх музейных работнікаў правільна іх выкарыстоўваць. Акрамя гэтага, не менш важным з'ўляецца і дакладнае захаванне традыцый і сакрэтаў майстроў. Паверце,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта больш проста і аб’ектыўна, чым пасля па крупінках шляхом тысячаў спроб і памылак нанова вынаходзіць кола.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ